

# ЦЕРАБУН УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ

## Сябра Беларускага саюза мастакоў, скульптар,

## Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь

Церабун Уладзімір Васільевіч нарадзіўся 11 красавіка 1946 года ў в. Несцяняты Смаргонскага раена Гродзенскай вобласці. З 1953г. па 1964г.- вучоба ў СШ №1 г. Смаргонь. З 1965 па 1968гг. – служба ў Савецкай Арміі.

З 1968 па 1973 гг. – вучоба ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (г.Мінск) на аддзяленні скульптуры. Вучыўся ў прафесара А.А.Бембеля, скульптара Г.І. Мурамцава. Інстытут закончыў з адзнакай і на адзін год датэрмінова. Пасля вучобы Церабун У.В. пераехаў у г. Гродна, дзе працаваў да 2001 г. З 2001 г. жыве і працуе ў г. Мінску. У выставах прымае ўдзел з 1974 г. У 1977г. быў прыняты ў сябры Беларускага саюза мастакоў (БСМ).

За свой творчы шлях мастак выканаў шэраг работ як станковага, так і манументальнага характара: скульптуры, скульптура з мазаікай , кампазіцыі з шкла і метала з вытокамі асвятлення (люстры) для грамадскіх будынкаў . Церабун У.В. правеў шаснаццаць персанальных выстаў. Яго работы экспанаваліся ў гарадах Гродна, Мінску, Лідзе, Маскве ,Ленінградзе, Троіцку, Зеленаградзе, Дубне, Таліне, Панявежысе, Шаўляі, Друскінінкаі, Варшаве і і нш.

У 1993г. выстаўка яго твораў экспанаваляся ў г.Міндане (Германія). Адна з работ была набыта галерэяй Фраў Фішар. Тры выставы прайшлі ў сябе на радзіме ў г.Смаргоні, дзе ён атрымаў званне “Ганаровага грамадзяніна горада” (1993г.). У маі 1995 г. выстава яго твораў прайшла у г.Ростаке (Германія), а ў лістападзе 1995 г. у г.Варшаве (Польшча).

Блізкая скульптару народная тэма. Прыкладам гэтаму можна назваць кампазіцыі, выкананыя ў дрэве: “Ясь і Яніна”, “Жалейка”,”Сымон-музыка”, “Летапісец”, “Апошняе жніво”. Яго творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь і фондзе Беларускага саюза мастакоў. У 1985 г. кампазіцыя “Расстраляная песня” экспанавалася на Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у г.Маскве. Аўтар атрымаў сярэбраны медаль выстаўкі. Кампазіцыі са шкла і метала з вытокамі асвятлення (люстры) сталі для мастака эксперыментальнай работай па мастацкаму аздабленню шэрагу інтэр’ераў. Да ліку

эксперыментальных і ўдалых спроб можна аднесці і скульптуру з мазаікай для плавальнага басейна ГВА “АЗОТ” ( г.Гродна 60 м2) . Тэматычныя рэльефныя кампазіцыі размясціліся ў абласным Палацы юнацкай творчасці ў г.Гродна (каля 100 м.кв.), выкананыя ў тэхніцы “выкалатка з алюмінія” і ў гіпсе. Нельга не сказаць і пра мемарыяльныя дошкі, выкананыя скульптарам: удзельнікам пасяджэння першага Савета рабочых дэпутатаў г.Гродна (1983г. г.Гродна) , польскай пісьменніцы Зофіі Налкоўскай (1989г. г.Гродна), генералу А.І. Антонаву (2004г. г.Гродна), Герою Савецкага Саюза Я.Ф. Філіпскіх (2004г. г.Мінск), хірургам В.Новікаву, Д.Шавялеву, Ч.Цярэшку (2006г. г.Смаргонь) суаўтар А.Крахалеў, заслужанаму работніку культуры Беларусі А.А.Дзяругу (2007г. г.Смаргонь), народнай артыстцы Беларусі Т.Каламійцавай (2011г. г.Мінск) суаўтар М. Бакуменка.

У шматлікіх сваіх творах аўтар неаднаразова звяртаецца да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Гэта кампазіцыі “Няскораны”, “Зноў аб вайне”, ”Дарогамі вайны”, “Хвіліна маўчання”, ”Развітанне славянкі”, ”Чаканне”,”Вясна перамогі” і інш.

Скульптар шмат працуе ў дробнай пластыцы з тэматыкай самога жыцця пад назвай “Ракурс” : экспрэсіі і спакою, разважання і задумленнасці, кахання і надзеі - тэмы пошуку сэнса існавання чалавека на гэтай Зямлі. Як бы дапаўняючы гэтую тэму , аўтар выконвае серыю малюнкаў пад такой жа назвай – “Ракурс”. Свой працяг пошуку аб’яднаць гармонію сасуда і дробнай пластыкі мы бачым у даволі вялікай серыі работ з гліны - керамікі. Больш за 20 гадоў аўтар шмат увагі надае пошуку сябе ў жывапісу у тэхніках алею і акварэлі . А гэта некалькі соцен работ на палатне,кардоне і паперы. Серыя носіць назву “Край мой родны”.

У 1993 мастак прымаў удзел у рабоце Міжнароднага сімпозіума - пленэра скульптараў у г.Міндане (Германія), а 1998 г. - у У11 Міжнародным пленэры, прысвечанаму 200-годдзю А.Міцкевіча (г.Навагрудак).

З 1979 г. па 1986г У.В. Церабун узначальваў Гродзенскую абласную арганізацыю БСМ, будучы яе старшынёй. У 1976 г. за стварэнне мемарыяльнага комплексу “Дальва” У.В. Церабун атрымаў прэмію Ленінскага камсамола Беларусі. Ён узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1978г.) і медалем “За працоўную доблесць” (1986г. г.Масква). Двойчы выбіраўся дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Больш за 50 сваіх твораў скульптар перадаў у дар музеям рэспублікі ў г.Гродна, г.Смаргонь, в.Гудзевічы Мастоўскага раёна. Шмат увагі мастак надае развіццю дзіцячай творчасці: конкурсы, выстаўкі, пленэры. З’яўляецца сябрам студыі ваенных мастакоў.

У 2005 годзе скульптар распрацаваў праект канцэпцыю рэстаўрацыі Мемарыяльнага комплексу “Дальва”. Паступова работы былі праведзены: абліцавана сцяна памяці гранітам, рэстаўравана скульптурная кампазіцыя, выкананая з медзі, зроблены новыя нацюрморты для прыступак хат, якія былі адліты з чыгуна, пракладзена алея ўздоўж згарэлых хат, устаноўлены азярод і гушкалка з дрэва. У 2013 годзе работы былі завершаны.

Як і ў іншых мастакоў, у скульптара шмат мейсца займае серыя партрэтаў нашых сучаснікаў: К.Цыалкоўскі, Ю.Гагарын, апаратчыца Г.Дзмітрыева, гімнастка А. Валчэцкая, кампазітар А.Шыдлоўскі, народны артыст СССР, БССР В.Роўда, заслужаны работнік культуры Беларусі А.Дзяруга.

Тры манументальныя работы выкананы ў суаўтарстве са скульптарам А.Крахалевым: памятны знак да 500-годдзя заснавання г. Смаргонь, ( 2003г.), памятны знак супрацоўнікам міліцыі , якія загінулі пры выкананні службовага і воінскага абавязкаў (г.Гродна 2004г.), памятны знак абаронцам г.Слуцка ў гады Вялікай Айчыннай вайны ( 2005г.)

У 2006г. у г.п. Бераставіца Гродзенскай вобласці ўстаноўлена скульптурная кампазіцыя “Дрэва жыцця” да 500-годдзя заснавання пасёлка, у 2007 г. на возеры Свіцязь усталявана кампазіцыя “Свіцязянка”, у 2008г. у г.Скідзелі Гродзенскай вобласці выканана кампазіцыя “Клёкат буслоў” з нагоды 500-годдзя заснавання горада, у гэтым жа годзе ў г.п. Зэльва, што на Гродзеншчыне, устаноўлена кампазіцыя анімалістычнага жанру з нагоды 750-годдзя заснавання пасёлка. Усе гэтыя творы выкананы з бронзы і граніту. У 2010 г. у г.Лагойску была ўстаноўлена кампазіцыя “Саната памяці”, прысвечаная воінам-інтэрнацыяналістам Лагойшчыны, якія загінулі пры выкананні воінскага абявязку (сілумін,граніт).

23 красавіка 2006 г. на радзіме ў г. Смаргоні была адкрыта 14-ая персанальная выстава пад назвай “На хвалях часу”, прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння скульптара. На ёй было прадстаўлена звыш 150 работ: скульптура, кераміка, акварэль, малюнкі, фотаздымкі пад назвай “Хроніка” і “Новыя праекты” манументальных работ. У лістападзе выстаўка з поспехам прайшла ў г.Гродна. У красавіку 2012 г. у г. Смаргонь адбылася чарговая 16-я персанальная выстава пад назвай “Няспраўджаныя мроі ў творчасці маей”, дзе скульптар прадставіў 35 праектаў – прапаноў манументальнага мастацтва па аздабленні і добраўпарадкаванні терыторый рэспублікі.

Багатымі на творчасць былі для сульптара і 2013 – 2014гг. На радзіме ў Смаргоні ўсталяваны памятны знак “Рэха вайны” воінам-інтэрнацыяналістам Смаргоншчыны, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку (2013г.), у

цэнтральным парку горада з’явілася яго кампазіцыя “Мядзведжая акадэмія”(2013г.), 3-га ліпеня у г.Слоніме на Гродзеншчыне быў урачыста адкрыты памятны знак “Адыйшлі ў бессмяроцце”, прысвечаны воінам-інтэрнацыяналістам Слонімшчыны. Па запрашэнню скульптара А.Арцімовіча (аўтара праекта) больш за восем гадоў , пачынаючы з 2006г.,працаваў у аўтарскім калектыве над праектаваннем і будаўніцтвам мемарыяльнага комплексу па лініі супрацьстаяння ў Першую сусветную вайну 1915-1917гг. у г. Смаргоні.1-га жніўня на тэрыторыі комплекса прайшоў мітынг-рэквіем .Работа працягваецца.

У 2007 г. за дасягненні ў развіцці выяўленчага мастацтва яму было прысвоена ганаровае званне “Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь”.

Уся творчасць У.В. Церабуна пабудавана на акадэмічнай школе бясконцага пошуку не толькі фізічнай прыгажосці мадэлі чалавека, але, перш за ўсе, аўтар імкнецца выявіць яе духоўны стан. Свой твор скульптар спрабуе давесці да вобраза, знака, сімвала са сваёй грамадзянскай пазіцыяй. Шчырасць самавыказвання - асноўны накірунак яго творчасці .

***Старшыня секцыі скульптуры БСМ***
***Шапо А.У. верасень 2014г.***

**ЦЕРАБУН Уладзімір Васільевіч, скульптар**
**Спіс персанальных выстаў**

1986г. - сакавік - першая прсанальная выстава да 40-годдзя з дня нараджэння ; прадстаўлена 145 работ: скульптура, малюнак,а таксама фотарэпрадукцыі манументальных твораў (г.Гродна, выставачная зала БСМ)

1986 г. - май - персанальная выстава ; прадстаўлена 56 работ: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г.Друскінінкай, санаторый “Літува”, Літва)

1986г. - чэрвень - персанальная выстава; прадстаўлена 70 работ: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г.Смаргонь, Гродзенская вобласць, гістрыка-краязнаўчы музей)

1987г. - сакавік - персанальная выстава; прадстаўзлена 70 работ: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г.Дубна, Маскоўская вобласць, Палац культуры)

1987г. - красавік – персанальная выстава; прадстаўлена 65 работ :скульптура, дробная пластыка, малюнак (г.Масква, Міністэрства фінансаў СССР, адміністратыўны будынак алмазнага фонду, вул.1812 г., 14)

1987г. - ліпень - персанальная выстава; прадстаўлена 62 работы: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г.Зеленаград, Маскоўская вобласць, выставачная зала)

1988г. - персанальная выстава; прадстаўлена 70 работ: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г. Троіцк, Маскоўская вобласць, выставачная зала)

1988г. - верасень - персанальная выстава; прадстаўлена 80 работ: скульптура. дробная пластыка, малюнак (г. Мінск, праспект Машэрава, 7, выставачная зала НДІ)

1993 г. - верасень - сімпозіум скульптараў; прадстаўлена 13 работ: дробная пластыка, малюнак (г. Міндэн, Германія, вестыбюль банка)

1993 г. - снежань - персанальная выстава; прадстаўлена 30 работ: дробная пластыка, кераміка, малюнак (г.Лондан, Англія, галерэя "Ковентры")

1994г. - красавік - персанальная выстава; прадстаўлена 85 работ: скульптура, дробная пластыка, кераміка, малюнак ( г. Ліда, Гродзенская вобласць, выставачная зала)

1995г. - май - персанальная выстава; прадстаўлена 40 работ: дробная пластыка, кераміка, малюнак (г.Ростак, Германія, Дом Моды фраў Крузе)

1995г. - верасень - персанальная выстава; прадстаўлена 30 работ: дробная пластыка, кераміка, малюнак (г.Варшава, Польшча, галерэя "Атэльер" Багдана Стадульнага)

1996 г. - жнівень - персанальная выстава; прадстаўлена 42 работы: скульптура, дробная пластыка, кераміка (г. Смаргонь, Гродзенская вобласць, Палац культуры)

2006г. - красавік - персанальная выстава "На хвалях часу"; прадстаўлена 125 работ: скульптура, кераміка, малюнак, акварэль (г.Смаргонь, Гродзенская вобласць, гісторыка-краязнаўчы музей)

2006г. - лістапад - персанальная выстава "На хвалях часу"; прадстаўлена 93 работы: скульптура, малюнак, кераміка, акварэль, а таксама 5 праектаў і 100 здымкаў работ з цыкла "Хроніка" (г.Гродна, выставачная зала БСМ)

2012 г. - красавік - персанальная выстава "Няспраўджаныя мроі ў творчасці маей" (няздзейсненых праектаў); прадстаўлена 35 праектаў (раздрукоўка і эскізы скульптур), а таксама ілюстратыўны матэрыял усталяваных манументальных твораў скульптара - 11 планшэтаў (20 твораў) (г.Смаргонь, Гродзенская вобласць, гісторыка-краязнаўчы музей)

верасень 2012г. Церабун У.В.